(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

**ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
"ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І
ФАЛЬКЛОРУ ІМЯ К. КРАПІВЫ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ"**

УДК [392.2+726.82](476)(091)"17/20"

**Грунтоў
Сяргей Уладзіміравіч**

# СЕМАНТЫКА МЕМАРЫЯЛЬНЫХ ПОМНІКАЎ БЕЛАРУСАЎ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія

Мінск, 2011

Работа выканана ў аддзеле нарадазнаўства Дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі"

**Навуковы кіраўнік:** **А. Вікт. Гурко**, доктар гістарычных навук, дацэнт, навуковы сакратар ДНУ "ІМЭФ імя К. Крапівы НАН Беларусі"

**Афіцыйныя апаненты:** **В. С. Цітоў**, доктар гістарычных навук, прафесар Прыватнай установы адукацыі "Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва"

**Т. В. Валодзіна**, доктар філалагічных навук, загадчык сектара этналінгвістыкі і фальклору ДНУ "Інстытут мовы і літаратуры імя Я.Коласа і Я.Купалы НАН Беларусі"

***Апаніруючая арганізацыя:*** Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

Абарона адбудзецца 17 лістапада 2011 года ў 13.00 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.01 пры Дзяржаўнай навуковай установе "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" (220072, г. Мінск, вул. Сурганава,1, корп. 2, п. 302. Тэл. вучонага сакратара 284-29-24; E-mail: a_hurko@basnet.by).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі".

Аўтарэферат разасланы 12 кастрычніка 2011 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
доктар гістарычных навук, дацэнт Г. І. Каспяровіч

Мемарыяльныя помнікі з'яўляюцца ўнікальным аб'ектам у культурнай прасторы этнасу. Яны ўзнікаюць у выніку рэалізацыі механізмаў пахавальных і памінальных практык, устойлівай і кансерватыўнай часткі традыцыйнай культуры, якая найменш змяняецца ў часе мадэрнізацыйных працэсаў. Дастаткова часта найбольш глыбінныя і архаічныя мадэлі, закладзеныя ў падмурках культуры, аказваюцца праяўленымі ў дыскурсе ці рытуальных практыках толькі ва ўскосных формах і непасрэдна ніколі не прамаўляюцца і не набываюць трывалых культурных форм. У гэтым кантэксце сярод аб'ектаў матэрыяльнай культуры мемарыяльныя помнікі не маюць аналагаў у тым, наколькі непасрэдна яны ўзнікаюць з базавых пластоў этнічнай культуры, якія прыдаюць форму ўсёй яе сістэме. Таму вельмі важна вылучыць асноўныя мадэлі, што фарміравалі семантыку мемарыяльнага помніка ў прасторы традыцыйнай сялянскай культуры беларусаў і культуры прывілеяваных саслоўяў у канцы XVIII – пачатку XX стагоддзя.

Немалаважным фактарам, які вызначае актуальнасць вывучэння мемарыяльных помнікаў, з'яўляецца іх месца ў нацыянальна-культурным развіцці беларускага этнасу. Захаванне культурнай спадчыны выступае адным з прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі і абавязкам грамадзянскай супольнасці. Значэнне мемарыяльных практык падкрэслена тым, што адзін з традыцыйных беларускіх дзён памінання памерлых прызнаны выхадным днём у Рэспубліцы Беларусь. Больш пільнай увагі патрабуе разгляд ролі вайсковых мемарыялаў ахвярам Вялікай Айчыннай вайны ў станаўленні беларускай нацыі.

Семантыка мемарыяльных помнікаў да сённяшняга дня асобна не разглядалася беларускай навукай. На сучасным этапе развіцця беларускай этналогіі адсутнічаюць абагульняючыя навуковыя даследаванні па дадзенай тэматыцы.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.**

Тэма дысертацыйнай работы адпавядае прыярытэтнаму накірунку фундаментальных навуковых даследаванняў "10.1. Тэарэтычнае абгрунтаванне шляхоў удасканалення беларускай мадэлі грамадскага развіцця і захавання нацыянальнай ідэнтычнасці ў кантэксце сусветных сацыяльных, эканамічных, палітычных і культурных працэсаў: вывучэнне фундаментальных праблем развіцця нацыянальных рыс рэгіянальнай і лакальнай разнастайнасці беларускай культуры" (зацверджана Пастановай Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі 31 жніўня 2006 года №418).

Дысертацыя выканана ў рамках навукова-даследчай тэмы "Традыцыі народнай культуры этнічных супольнасцяў Беларусі: гісторыя, сучасны стан і перспектывы развіцця" (*нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20061100*), якая выконвалася ў рамках Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых *даследаванняў "Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры"* ("Гісторыя і культура").

**Мэта і задачы даследавання.**

*Мэта дысертацыйнай* работы: вызначыць этнічныя мадэлі семантыкі мемарыяльных помнікаў Беларусі і выявіць іх трансфармацыю на працягу XVIII - XXI ст.

Для дасягнення пастаўленай мэты вырашаюцца наступныя задачы:

1. Выявіць семантыку і функцыі мемарыяльных помнікаў у прасторы беларускай сялянскай культуры канца XVIII – пачатку XX ст.

2. Раскрыць семантыку і функцыі мемарыяльных помнікаў прывілеяваных саслоўяў Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.

3. Вывучыць ролю вайсковых мемарыялаў Вялікай Айчыннай вайны ў патрыятычным выхаванні беларусаў.

4. Ахарактарызаваць напрамкі развіцця семантыкі грамадзянскіх мемарыяльных помнікаў у прасторы беларускай культуры XX – пачатку XXI ст.

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца мемарыяльныя помнікі беларусаў канца XVIII – пачатку XXI стагоддзя. Выбар аб'екта даследавання абумоўлены тым, што да гэтага часу ў беларускай этналогіі не ажыццяўлялася ў поўным аб'ёме вывучэнне мемарыяльных помнікаў і іх семантыкі ў прасторы беларускай культуры акрэсленага перыяду. Беларусь у перыяд Расійскай імперыі разглядаецца ў межах, вызначаных айчыннай этналогіяй (тэрыторыі Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай, а таксама ўсходніх частак Віленскай і Ковенскай губерняў Расійскай імперыі). Прадметам дысертацыйнага даследавання з'яўляецца семантыка мемарыяльных помнікаў канца XVIII – пачатку XXI стагоддзя.

**Палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. Семантыка мемарыяльных помнікаў у беларускай сялянскай культуры канца XVIII – пачатку XXI стагоддзя вызначалася традыцыйнымі пахавальна-памінальнымі практыкамі і мела функцыянальную скіраванасць. Мемарыяльныя помнікі ў беларускай сялянскай культуры выконвалі функцыю медыятара паміж жывымі і памерлымі, удзельнічалі ў сімвалічным абмене паміж імі, накіраваным на пераадоленне структурнага шоку ў выніку кантакту са смерцю. Увесь пахавальна-памінальны абрад разглядаецца як эфектыўная сістэма, скіраваная ў першую чаргу на патрэбы жывых, што

абумоўлівала стабільнасць і ўстойлівасць гэтага абраду ў часе. Пахавальна-памінальны комплекс з'яўляецца найбольш архаічным для традыцыйнай культуры беларусаў. Паступовае забыванне асобы памерлага вяло да фарміравання катэгорый ідэнтычнасці на больш высокіх узроўнях сям'і і вясковай супольнасці. Упершыню ў айчыннай этналогіі ўстаноўлена, што працэс забывання памерлых і занядбання помнікаў прадвызначаны разгортваннем пахавальна-памінальных практык.

2. Семантыка мемарыяльных помнікаў прывілеяваных саслоўяў беларусаў вызначалася ўзаемаўплывам родавага, лінгва-канфесіянальнага, прафесійнага і грамадзянскага кампанентаў ідэнтычнасці. У адрозненне ад сялянскіх пахаванняў таго ж перыяду, гэтыя кампаненты мелі рухомы і зменлівы характар, утваралі разнастайныя камбінацыі ў залежнасці ад канкрэтных гісторыка-культурных умоў. Пры гэтым асноўным з'яўляўся сямейны кампанент і скіраванасць на рэпрэзентацыю і захаванне статусу роду. Мова, сімволіка і форма, якія выкарыстоўваліся пры стварэнні мемарыяльнага помніка, фарміравалі семіятычны код, што вызначаў ступень інтравертнасці / экстравертнасці помніка. Гэтая градацыя вызначала меру талерантнасці адносін у грамадстве да пэўнага тыпу помніка, негатыўны бок чаго асабліва праяўляўся ў крызісныя і пераломныя эпохі. Упершыню ў айчыннай гісторыі і этналогіі мемарыяльныя помнікі разглядаюцца не як прадукт спантаннага эвалюцыйнага развіцця і змены стыляў, а як аб'екты, дзе рэалізоўваўся вызначальны канфлікт супрацьлеглых ідэалогій.

3. Узвядзенне мемарыяльных помнікаў ахвярам Вялікай Айчыннай вайны і стварэнне рытуалаў па ўшанаванні памяці загінуўшых сталі важнымі элементамі кансалідацыі беларускай нацыі і патрыятычнага выхавання беларусаў. Уведзеныя ў культурную прастору аб'екты выступілі значным фактарам кансалідацыі беларускага этнасу. Мемарыялы агульнарэспубліканскага значэння, такія як Хатынь і Брэсцкая крэпасць-герой, сталі першымі культурнымі аб'ектамі, якія для насельніцтва рэспублікі і суседніх краін атаясамліваюцца з Беларуссю. У сучаснай Беларусі вайсковыя мемарыялы захоўваюцца ў якасці значнага аб'екта этнічнай прасторы, а семантычныя мадэлі, сфарміраваныя вакол іх, рэалізуюцца пры ўзвядзенні новых мемарыяльных помнікаў.

4. Семантыка мемарыяльных помнікаў цывільнага насельніцва Беларусі ў XX – пачатку XXI ст. сфарміравалася на базе семантыкі аналагічных аб'ектаў традыцыйнай беларускай культуры. Змены XX – пачатку XXI стагоддзя можна назваць другаснымі ў адносінах да папярэдніх мадэляў, паколькі яны не закранаюць базавыя механізмы семантыкі, а з'яўляюцца вынікам іх рэалізацыі ў новых культурных умовах. Некаторае пашырэнне атрымалі альтэрнатыўныя варыянты мемарыяльных помнікаў і

звязаныя з імі мемарыяльныя практыкі (выкарыстанне калумбарыяў і крэмацыя), аднак на сённяшні дзень яны не сфарміравалі вакол сябе альтэрнатыўных семіятычных мадэляў, уяўляючы не зусім удалыя варыянты прыстасавання да традыцыйных схем.

**Асабісты ўклад суіскальніка.**

Дысертацыя з'яўляецца самастойным даследаваннем і змяшчае вынікі, атрыманыя суіскальнікам на падставе этналагічнага аналізу самастойна сабраных палявых матэрыялаў, пісьмовых крыніц, прац беларускіх і замежных даследчыкаў. Упершыню ў айчыннай этналогіі праведзены комплексны аналіз семантыкі мемарыяльных помнікаў Беларусі канца XVIII – пачатку XXI стагоддзя: сістэматызавана гістарыяграфія праблемы (паводле храналагічнага прынцыпу) і крыніцы (паводле тэматычнага прынцыпу); прыцягнуты да этналагічнага вывучэння вялікі аб'ём звестак, сабраных у часе палявых даследаванняў (мемарыяльныя помнікі і інтэрв'ю з інфармантамі); распрацавана мадэль трансфармацыі семантыкі мемарыяльных помнікаў прадстаўнікоў традыцыйнай сялянскай культуры; вызначаны асноўныя складаючыя часткі семантыкі мемарыяльных помнікаў прывілеяваных саслоўяў і прынцыпы іх узаемадзеяння; выяўлена роля вайсковых мемарыялаў Вялікай Айчыннай вайны ў патрыятычным выхаванні беларусаў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.**

Асноўныя палажэнні дысертацыі апрабаваны аўтарам у дакладах на наступных канферэнцыях:

1. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Навука, адукацыя і культура: стан і перспектывы інавацыйнага развіцця" (Мазыр, 2008).
2. Міжнародная навуковая канферэнцыя "Праблемы вывучэння культурных сувязей на этнакантактных тэрыторыях у славянскім свеце" (Мінск, 2008).
3. Міжнародная навуковая канферэнцыя "Палявая этнаграфія – 2008" (Санкт-Пецярбург, 2008).
4. Міжнародная навуковая канферэнцыя "Моладзь у навуцы – 2009" (Мінск, 2009).
5. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Традыцыі і сучаснае становішча культуры і мастацтваў" (Мінск, 2009).
6. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Нясвіжскі палац Радзівілаў: гісторыя, новыя даследаванні, вопыт стварэння музейных калекцый" (Нясвіж, 2009).

7. Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя “Роля традыцыйнай народнай культуры ў адраджэнні беларускага сяла” (Іванава, 2010).

Вынікі даследавання ўкаранены ў навуковы працэс на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў спецкурсе “Сям’я і сямейная абраднасць беларусаў”.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.**

Вынікі даследавання апублікаваны ў чатырох артыкулах у навуковых выданнях, уключаных у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, і пяці зборніках артыкулаў і матэрыялаў каферэнцый. Агульны аб’ём артыкулаў у навуковых выданнях, уключаных у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, - 1,9 аўтарскага аркуша, агульны аб’ём усіх публікацый– 3,65 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб’ём дысертацыі.**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, пабудаваных згодна са структурна-функцыянальным прынцыпам, заключэння, бібліяграфічнага спісу і дадатку. Логіка пабудовы дысертацыйнай работы абумоўлена мэтай і задачай даследавання. Аб’ём тэкставай часткі - 100 старонак, агульны - 113 старонак. Бібліяграфічны спіс (разам з асабістымі публікацыямі) утрымлівае 171 назву.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі.**

1. Семантыка мемарыяльных помнікаў у беларускай сялянскай культуры канца XVIII – пачатку XX ст. вызначалася традыцыйнымі пахавальна-памінальнымі практыкамі і мела функцыянальную скіраванасць. Мемарыяльныя помнікі ў беларускай сялянскай культуры выконвалі функцыю медыятара паміж жывымі і памерлымі, удзельнічалі ў сімвалічным абмене між імі, накіраваным на пераадоленне структурнага шоку ў выніку кантакту са смерцю. Увесь пахавальна-памінальны абрад з'яўляецца эфектыўнай сістэмай, скіраванай на патрэбы жывых, што абумоўлівае яго стабільнасць і ўстойлівасць у часе. Менавіта звязанасць з актуальнымі патрэбамі супольнасці і псіхікі асобнага чалавека – блізкага памерлага – з'яўляецца тым ядром, якое фарміравала і вызначала стабільнасць абраду, таму міфа-сімвалічныя трактоўкі разглядаюцца як другасныя адносна функцыянальных. Гэта ж тлумачыць той факт, што пахавальна-памінальны комплекс лічыцца найбольш архаічным для ўсёй традыцыйнай культуры беларусаў. Упершыню ў айчыннай этналогіі разглядаюцца пабочныя элементы працякання мемарыяльных практык, такія як забыванне памерлых і занядбанне помнікаў не як парушэнне традыцыі і дэвіяцыя, а як прадугледжаныя ўнутраным разгортваннем абраду функцыянальна неабходныя працэсы. Абумоўленае абрадамі паступовае забыванне асобы памерлага вяло да фарміравання катэгорый ідэнтычнасці на больш высокіх узроўнях сям'і і вясковай супольнаці. Пераход ад індывідуальных памінак да калектыўных, ад памінання асобы памерлага да "дзядоў" адпавядаў сімвалічнаму зацвярджэнню форм супольнага жыцця над асабовым [5, 6, 9].

2. Семантыка мемарыяльных помнікаў прывілеяваных саслоўяў Беларусі вызначалася ўзаемаўплывамі рэлігійнага, сямейнага і грамадзянскага кампанентаў. У адрозненне ад сялянскіх пахаванняў таго ж перыяду, гэтыя кампаненты мелі рухомы і зменлівы характар і ўтваралі разнастайныя камбінацыі ў залежнасці ад канкрэтных гісторыка-культурных умоў. Пры гэтым асноўным з'яўляўся сямейны кампанент і скіраванасць на рэпрэзентацыю і захаванне статусу роду. Люстрацыі шляхты, страх разарыцца ці страціць маёмасць і статус у выніку тых ці іншых рэпрэсіўных дзеянняў з боку ўрада, неабходнасць вытрымліваць канкурэнцыю з расійскім дваранствам, якое набывала землі на далучаных тэрыторыях, актуалізавалі праблему ўласнай ідэнтычнасці, імкненне да захавання якой мы знаходзім у разнастайных формах рэалізацыі семантыкі мемарыяльных помнікаў. Мова, сімволіка і форма, што выкарыстоўваліся пры стварэнні мемарыяльнага помніка, фарміравалі семіятычны код, які паказваў ступень інтравертнасці /

экстравертнасці помніка. Гэтая градацыя вызначала меру талерантнасці адносін у грамадстве да пэўнага тыпу помніка, негатыўны бок чаго асабліва праяўляўся ў крызісныя і пераломныя эпохі. Упершыню ў айчыннай гісторыі і этналогіі мемарыяльныя помнікі разглядаюцца не як прадукт спантаннага эвалюцыйнага развіцця і змены стыляў, а як аб'екты, дзе рэалізоўваўся вызначальны канфлікт супрацьлеглых ідэалогій. Такі падыход дазваляе прасачыць заканамернасці, якія абумоўлівалі змены ў акрэслены перыяд [2, 4, 7].

3. Узвядзенне мемарыяльных помнікаў ахвярам Вялікай Айчыннай вайны і стварэнне мемарыяльных рытуалаў сталі важнымі элементамі патрыятычнага выхавання беларусаў. Уведзеныя ў культурную прастору аб’екты выступілі адным з ядзер кансалідацыі беларускага этнасу. Разам з гербам, сцягам, гімнам, рэспубліканскімі сродкамі масавай інфармацыі і фарміраваннем стабільнай мяжы краіны яны з’яўляюцца тымі сімвалічнымі элементамі, якія на падсвядомым узроўні зацвярджалі адзінства і самастойнасць рэспублікі. Менавіта ўзведзеныя мемарыялы агульнарэспубліканскага значэння, такія як Хатынь і Брэсцкая крэпасць-герой, сталі першымі культурнымі аб’ектамі, якія для насельніцтва рэспублікі і суседніх краін атаясамліваюцца з Беларуссю [8].

4. Семантыка мемарыяльных помнікаў цывільнага насельніцва Беларусі ў XX – пачатку XXI ст. сфарміравалася на базе семантыкі аналагічных аб’ектаў традыцыйнай беларускай культуры; змены, што адбыліся, можна назваць другаснымі, паколькі яны не закранаюць базавых механізмаў семантыкі, а з’яўляюцца вынікам іх рэалізацыі ў новых культурных умовах. У той жа час, з фармальнага пункту гледжання, колькасць новаўвядзенняў была даволі высокай: у першую чаргу гэта датычыцца матэрыялу, з якога выраблялiся помнікі, і распаўсюджвання фатаграфічных выяў. Некаторае пашырэнне, пераважна ў найбольш буйных гарадах, атрымалі альтэрнатыўныя варыянты мемарыяльных помнікаў і звязаныя з імі мемарыяльныя практыкі, такія як калумбарыі і крэмацыя, аднак на сённяшні дзень яны не сфарміравалі вакол сябе альтэрнатыўных семіятычных мадэляў, уяўляючы не зусім удалыя варыянты прыстасавання да традыцыйных схем [1, 3, 7].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў.**

1. Прапанаваны ў другой главе аналіз семантыкі мемарыяльных помнікаў у традыцыйнай сялянскай культуры беларусаў і атрыманыя ў выніку яго схемы могуць быць карыснымі і ў іншых этналагічных даследаваннях аб’ектаў з блізкай ці падобнай структурай. Выкарыстаная

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Артыкулы ў навуковых часопісах:**


1. Грунтоў, С. У. Агляд гістарыяграфіі вывучэння мемарыяльных помнікаў па матэрыялах фондаў Львоўскай навуковай бібліятэкі ім. Стэфаніка / С. У. Грунтоў // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; навуковы рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2008. – Вып. 4. – С. 241 – 247.
2. Грунтоў, С. У. Семантыка мемарыяльных помнікаў прывілеяваных саслоўяў у беларускай культуры канца XVIII – пач. XX ст. / С. У. Грунтоў // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; навуковы рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2008. – Вып. 6. – С. 335 – 343.
3. Грунтов, С. В. Проблеми та перспективи етнологічного дослідження меморіальних пам'ятників Білорусі XIX – початку XXI століття / С. В. Грунтов // Народна творчість та этнографія. – 2009. – №6. – С. 124 – 126.
4. Грунтоў, С. У. Праблема выкарыстання і інтэрпрэтацыі крыніц па вывучэнні семантыкі мемарыяльных помнікаў Беларусі / С. У. Грунтоў // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; навуковы рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2009. – Вып. 7. – С. 240 – 245.
5. Грунтоў, С. У. Семантыка мемарыяльных помнікаў у прасторы традыцыйнай сялянскай культуры канца XVIII – пачатку XX ст. і іх роля ў фарміраванні лакальных ідэнтычнасцей / С. У. Грунтоў // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; навуковы рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2010. – Вып. 9. – С. 263 – 271.


**Артыкулы ў зборніках навуковых прац:**


6. Грунтоў, С. У. Могілкі як горад : культуралагічны аналіз метафары на прыкладзе гарадоў могілак Заходняй Беларусі (канец XVIII – XX стст.) / С. У. Грунтоў // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры : зб. навук. арт. – Гродна : ГрДУ, 2007. – С. 307 – 310.

7. Грунтов, С. В. Память и забвение в пространственной перспективе : к функциональному анализу семантики белорусских традиционных кладбищ / Грунтов С. В. // Проблемы методологии социогуманитарного познания : диалектика и герменевтика : материалы Междунар. коллоквиума, 14 мая 2009, Минск / редкол. : М. Е. Кобринский (главн. ред) [и др.] – Минск, 2009. – С. 186 – 188.

**Матэрыялы канферэнцый:**

8. Грунтоў, С. У. Нарубы і іх мураваныя аналагі на могілках Палесся : марфалогія і семантыка / С. У. Грунтоў // Наука, образование и культура : состояние и перспективы инновационного развития: материалы Междунар. науч.-практ. конф., г. Мозырь, 27-28 апреля 2008 г. : в 2 ч. – Мозырь, 2008. – Ч. 2. – С. 210 – 212.
9. Грунтоў, С. У. Вайсковыя мемарыяльныя помнікі Беларусі ў XX - пачатку XXI ст. / С. У. Грунтоў // Роля традыцый народнай культуры ў адраджэнні беларускага сяла : матэрыялы Рэспубл. навук.-практ. канф. ; 24 верасня 2010 г., г. Іванава. – Мінск, 2010. – С. 198 – 205.

## РЭЗЮМЭ

Грунтоў Сяргей Уладзіміравіч

**Семантыка мемарыяльных помнікаў белорусов канца XVIII – пачатку XXI стагоддзя.**

**Ключавыя словы:** мемарыяльны помнік, могілкі, пахавальна-памінальныя практыкі, матэрыяльная, сацыяльная, духоўная культура, прывілеяванае саслоўе, семантыка.

**Мэта даследавання:** вызначыць этнічныя мадэлі семантыкі мемарыяльных помнікаў Беларусі і вывучыць іх трансфармацыю на працягу канца XVIII – пачатку XXI стагоддзя.

**Метады даследавання:** спалучэнне функцыянальнага метаду і семантычнага аналізу, гісторыка-параўнальны метад, метадалогія палявых даследаванняў.

**Навуковая навізна вынікаў даследавання:** упершыню ў айчыннай этналогіі праведзены комплексны аналіз семантыкі мемарыяльных помнікаў Беларусі канца XVIII – пачатку XXI стагоддзя, сістэматызавана гістарыяграфія праблемы і крыніцы, прыцягнуты да этналагічнага вывучэння новыя пісьмовыя гістарычныя крыніцы XIX стагоддзя і вялікі аб'ём непісьмовых крыніц, зафіксаваных у часе палявых экспедыцый, што стала асноўным матэрыялам для напісання дысертацыі; распрацавана мадэль трансфармацыі семантыкі мемарыяльнага помніка ў беларускай традыцыйнай культуры, выяўлены комплекс фактараў і ўзаемаўплываў, якія вызначалі развіццё семантыкі мемарыяльных помнікаў прывілеяваных саслоўяў; вывучана роля вайсковых мемарыялаў ахвярам Вялікай Айчыннай вайны ў патрыятычным выхаванні беларусаў.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** вынікі даследавання могуць выкарыстоўвацца навуковымі ўстановамі, якія займаюцца вывучэннем культуры беларускага этнасу, у ВНУ пры падрыхтоўцы спецкурсаў па этналогіі і гісторыі культуры Беларусі, арганізацыямі, якія ажыццяўляюць догляд за могілкамі, пры распрацоўцы новых мемарыялаў.

## РЕЗЮМЕ

Грунтов Сергей Владимирович

**Семантика мемориальных памятников белорусов конца XVIII – начала XXI века.**

**Ключевые слова:** мемориальный памятник, кладбище, погребально-поминальные практики, материальная, социальная, духовная культура, привилегированное сословие, семантика.

**Цель исследования:** определить этнические модели семантики мемориальных памятников Беларуси и изучить их трансформацию на протяжении конца XVIII – начала XXI века.

**Методы исследования:** сочетание функционального метода и семантического анализа, историко-сравнительный метод, методология полевых исследований.

**Научная новизна результатов исследования:** впервые в отечественной этнологии проведён комплексный анализ семантики мемориальных памятников Беларуси конца XVIII – начала XXI века, систематизирована историография проблемы и источники, привлечены к этнологическому изучению новые письменные исторические источники XIX века и большой объём неписьменных источников, зафиксированных во время полевых экспедиций, что стало основным материалом для написания диссертации; разработана модель трансформации семантики мемориального памятника в белорусской традиционной культуре, выявлен комплекс факторов и взаимовлияний, определявших развитие семантики мемориальных памятников привилегированных сословий; изучена роль военных мемориалов жертвам Великой Отечественной войны в символическом становлении белорусской нации.

**Рекомендации по использованию:** итоги исследования могут быть использованы научными учреждениями, которые занимаются изучением культуры белорусского этноса, в ВУЗах при подготовке спецкурсов по этнологии и истории культуры Беларуси, организациями, которые осуществляют уход за кладбищами, при разработке новых мемориалов.

## SUMMARY

Siarhei Hruntou

**Semantics of the memorial monuments of Belorussians at the the end of the 18$^{th}$ – beginning of the 21$^{st}$ century.**

**Key words: memorial** monument, cemetery, burial and commemorative practices, material, social, spiritual culture, privileged estates, semantics.

**Research purpose**: to determine ethnical models of the semantics of memorial monuments of Belarus and to study its transformations from the end of 18$^{th}$ to the beginning of the 21 centuries.

**Research methods:** combination of functional method and semantics' anlyse, historical comporative method, methods of field research.

**Scientific novelty of research results:** for the first time in native ethnology a complex analyse of the semantics of Belorussian memorial monuments from the end of 18th to the beginning of 21 century was realized. A systematic order was given to the hitoriography and sources, new historical written sources of the 19th century were brought into ethnological research. Large quantity of unwritten sources fixed at the time of field researchs and became a foundation for this PhD paper. The model of memorial monument's semantics transformation in Belorussia traditional culture was elaborated. There was discovered a complex of factors and influences what determined development of memorial monuments of privileged estates. The role of war memorials to the victims of the Great Patriotic war in symbolic formation of the Belorussian nation was highlighted.

**Recomendations of the use:** research results can be used with scientific institutions what studies the culture of Belorussian peoples, in high schools for working out special courses on ethnology and history of the Belorussian culture, with organizations what provide cemetery managing and althou in elaboration of new monument of national and regional scale.

Подписано в печать 10.10.2011 Формат 60x84 1/16 Бумага офсетная Гарнитура Roman
Печать цифровая. Усл.печ.л. 1,3 Уч.изд.л. 1,4 Тираж 60 экз. Заказ № 1314
ИООО «Право и экономика» Лицензия ЛИ № 02330/0494335 от 16.03.2009
220072 Минск Сурганова 1, корп. 2 Тел. 284 18 66, 8 029 684 18 66
E-mail: pravo-v@tut.by
Отпечатано на издательской системе KONICA MINOLTA
в ИООО «Право и экономика»